От того, смогут ли правительства стран региона совместить национальные потенциалы и приоритеты, а также свою политику со стратегиями, реализуемыми ТНК, во многом зависит степень их успеха в конкуренции за привлечение ПИИ и, соответственно, в развитии их экономических систем. Такие действия не могут быть единовременной инициативой и заключаться только в либерализации экономики и внешнеэкономических отношений. Это продолжительный процесс создания «страновых» конкурентных преимуществ, в котором формирование базы для высокотехнологичных ПИИ в виде квалифицированной рабочей силы и соответствующей инфраструктуры, а также построение взаимоотношений государств, местных предприятий с иностранными инвесторами играют ведущую роль. Руководство стран Центральной и Восточной Европы должно осознавать важность динамизма в определении рыночной ниши для национальных экономик и необходимость пересмотра своих действий по мере развития условий конкуренции и корпоративных стратегий.

## КРАІНЫ – АСНОЎНЫЯ ЗНЕШНЕГАНДЛЁВЫЯ ПАРТНЁРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Бушчык Г.П.*, Беларускі дзяржаўны універсітэт

Беларусь гандлюе больш чым са ста краінамі свету. Знешнегандлёвы тавараабарот за перыяд суверэннага існавання дзяржавы ў 1992–2002 гг. павялічыўся ў 2,4 раза (з 7054 да 17113 млн. дол.), прычым экспарт павялічыўся ў 2,3 раза (з 3559 да 8021 млн. дол.), імпарт – у 2,6 раза (з 3495 да 9092 млн. дол.). Разам з тым асноўных гандлёвых партнёраў, удзельная вага якіх у тавараабароце Беларусі была ў 2002 г. больш за 2%, налічваецца менш за дзесятак (гл. табл. 1).

Асноўным партнёрам Беларусі ў знешнім гандлі з'яўляецца Расія (42,8–59,4% ад знешнегандлёвага тавараабароту). Сярод астатніх можна выдзеліць чатыры краіны: Германію, Украіну, Польшчу, Літву, тавараабарот з якімі ў сярэднім за год перавышаў 2% ў тавараабароце Беларусі. Да гэтай групы наблізілася і Латвія, доля якой у сярэднім складала 1,9% за год.

*Табліца 1*

| Краіны | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 | 2001 | 2002 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. Расія | 46,2 | 42,8 | 54,4 | 49,7 | 52,0 | 59,1 | 59,4 | 55,5 | 58,3 | 59,7 | 57,8 |
| 2. Германія | 2,4 | 10,9 | 9,2 | 6,7 | 6,3 | 5,7 | 6,1 | 7,2 | 5.1 | 5,4 | 6,1 |
| 3. Украіна | 16.0 | 9,3 | 7,1 | 11,3 | 10,9 | 8,7 | 7,2 | 5,5 | 5,7 | 4,5 | 3,29 |
| 4. Вялікабрытанія | 1,0 | 1,4 | 0,7 | 0,9 | 1,0 | 0.8 | 1,0 | 1,0 | 1,3 | 1,8 | 3,28 |
| 5. Латвія | 1,2 | 0,6 | 0,8 | 2,4 | 1,5 | 0,9 | 1,5 | 2,3 | 3,1 | 3,4 | 3,25 |
| 6. Польшча | 3,6 | 4,2 | 4,3 | 4,5 | 4,2 | 3,1 | 3,0 | 3,3 | 3,1 | 2,9 | 2,9 |
| 7. Літва | 1,6 | 1,0 | 0,9 | 2,5 | 2.4 | 2,1 | 2,3 | 2,2 | 2,6 | 2,5 | 2,14 |
| 8. Нідэрланды | 0,9 | 1,1 | 1,0 | 1,6 | 1,4 | 0,9 | 1,1 | 1,1 | 1,3 | 1,3 | 2,12 |
| 9. Італія | 0,5 | 1,1 | 1,0 | 1,4 | 1,3 | 1,4 | 1,6 | 1,8 | 1,5 | 1,6 | 2,02 |

Удзельная вага краін у знешнегандлёвым тавараабароце Беларусі, доля якіх у 2002 г. перавышала 2% (экспарт плюс імпарт у%)

Другім па значнасці гандлёвым партнёрам Беларусі пасля Расіі да 2001 г. была Украіна. У 1992 г. Украіна мела 16% у тавараабароце РБ, але з 1992 да 2002 г. яе доля знізілася амаль у 5 разоў і ў 2002 г. склала толькі 3,3%. У выніку Украіна, саступіўшы з 2001 г. другое месца Германіі, заняла 3-е месца ў гандлі з Беларуссю, нязначна апярэдзіўшы ў 2002 г. Вялікабрытанію і Латвію. Польшча перамясцілася з 3-га месца, якое яна займала ў 1992 г., на 6-е ў 2002 г. У 2002 г. Літва, Нідэрланды і Італія амаль зраўняліся па долі ў тавараабароце Беларусі.

Сярод асноўных партнёраў РБ як блізкія суседзі, так і даволі аддаленыя еўрапейскія краіны. Прыкметна, што ў гандлі з Беларуссю члены і кандыдаты ў члены ЕС апераджаюць большасць краін СНД. Італія, Вялікабрытанія і Нідэрланды толькі ў 2002 г. пераадолелі 2% рубеж у беларускім знешнегандлёвым тавараабароце, а Вялікабрытанія нават заняла 4-е месца. Вялікабрытанія, Латвія і Нідэрланды занялі свае пазіцыі ў беларускім знешнім гандлі галоўным чынам за кошт беларускага экспарту нафтапрадуктаў. У 2002 г. у Вялікабрытанію было экспартавана нафтапрадуктаў на 456,7 млн. дол.(з 493,7 млн.дол. агульнага экспарту ў гэту краіну), Латвію – на 431,55 млн.дол. (з 520,1 млн. дол. экспарту), Нідэрланды – на 222,9 млн. дол. (з 279,0 млн. дол. экспарту). Знешнегандлёвае сальда з гэтымі краінамі станоўчае на карысць Беларусі. У тавараабароце Беларусі з Расіяй, Германіяй і Італіяй значна пераважае імпарт з гэтых краін, сальда складвалася ў большасці адмоўнае.

*Табліца 2*

| Краіны | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 | 2001 | 2002 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. Расія | 39,9 | 40,1 | 46,1 | 45,5 | 53,5 | 65,5 | 65,2 | 54,5 | 50,6 | 53,2 | 49,6 |
| 2. Латвія | 1,5 | 0,9 | 1,0 | 4,1 | 2,5 | 1,0 | 2,4 | 4,4 | 6,4 | 6,6 | 6,5 |
| 3. Вялікабрытанія | 1,0 | 1,0 | 0,8 | 0,8 | 0,6 | 0,4 | 0,5 | 0,9 | 1,3 | 3,0 | 6,2 |
| 4. Германія | 1,8 | 5,2 | 6,5 | 5,6 | 3,5 | 3,0 | 2,8 | 3,6 | 3,2 | 3,2 | 4,3 |
| 5. Нідэрланды | 1,2 | 1,4 | 1,0 | 1,6 | 1,1 | 1,1 | 1,1 | 0,9 | 1,8 | 1,7 | 3,5 |
| 6. Польшча | 4,5 | 4,5 | 4,4 | 5,7 | 6,0 | 3,4 | 2,6 | 3,5 | 3,8 | 3,3 | 3,41 |
| 7. Украіна | 15,9 | 13,0 | 9,8 | 12,6 | 8,5 | 5,8 | 5,5 | 4,7 | 7,6 | 5,6 | 3,39 |
| 8. Літва | 1,6 | 1,1 | 1,4 | 3,0 | 2,6 | 1,9 | 2,2 | 3,0 | 4,8 | 3,7 | 3,2 |
| 9. Кітай | 0,8 | 1,5 | 1,7 | 0,6 | 1,6 | 1,6 | 1,8 | 3,4 | 2,0 | 1,9 | 2,7 |

Удзельная вага ў экспарце Беларусі краін – асноўных імпарцёраў беларускай прадукцыі (у%)

Калі вызначаць сярод краін тыя, куды паступае найбольш беларускага экспарту, то на першым месцы з вялікім адрывам знаходзіцца таксама Расія (гл. табл. 2). У Расію ішло ад 39,9 да 65,5% экспарту Беларусі. Найбольшую долю ў экспарце Беларусі Расія мела ў 1997–1998 гг.: 4,8 і 4,6 млрд. дол. адпаведна; але пасля крызісу 1998 г. доля і кошт экспарту ў Расію скараціліся. У 2002 г. сярод артыкулаў беларускага экспарту ў Расію найпершымі па кошце былі грузавыя аўтамабілі (260,2 млн. дол.), трактары (223,5 млн. дол.), халадзільнікі (160,1 млн. дол.), мэбля і яе часткі (126,1 млн. дол.), запчасткі для аўтамабіляў і трактараў (115,6 млн. дол.). Усяго экспарт у Расію ў 2002 г. складаў амаль 4 млрд. дол.

У рэйтынгавым спіску найпершых спажыўцоў беларускага экспарту на 2002 г. з 9-ці тых краін, што лідзіруюць у беларускім тавараабароце, адсутнічае Італія, якая займае больш высокую пазіцыю ў імпарце. Разам з тым у ліку спажыўцоў беларускага экспарту Латвія і Вялікабрытанія занялі другое і трэцяе месца пасля Расіі, апярэдзіўшы нават Германію. Кошт экспарту ў Латвію склаў у 2002 г. 520,1 млн. дол., у Вялікабрытанію – 493,7 млн. дол. Астатнія з вышэй прадстаўленых краін таксама спажывалі беларускі экспарт больш чым на 200 млн. дол. Акрамя Расіі і Кітая, большасць беларускага экспарту ў гэтыя краіны складалася з прадуктаў нафтаперапрацоўкі. У Расію і Кітай экспартуецца ў асноўным прамысловая прадукцыя і транспартныя сродкі.

У імпарце Беларусі, як і па тавараабароце, лідзіруюць Расія, Германія і Украіна. У 2002 г. доля Расіі была найбольшай – 65,1% (5,9 млрд. дол.). Асноўнае месца ў імпарце Беларусі з Расіі займаюць мінеральныя прадукты; машыны, абсталяванне і транспартныя сродкі; чорныя і каляровыя металы і вырабы з іх; прадукцыя хімічнай прамысловасці (у 2002 г. адпаведна 39, 15, 14 і 11%). У 2002 г. нафты было імпартавана на 1504,5 млн. дол., нафтапрадуктаў – на 87,3 млн. дол., газу – на 538,55 млн. дол.; электраэнэргіі – на 84,9 млн. дол., рыбы марожанай – на 82,4 млн. дол.; макаронных вырабаў – на 74,6 млн. дол.; рухавікоў унутранага спальвання – на 68,8 млн. дол.

Доля Германіі ў імпарце Беларусі была найменьшай ў 1992 г. – 3,1%, найбольшай у 1992 г. – 15,4%, а ў сярэднім – 7–8%. У імпарце з Германіі пераважаюць машыны і абсталяванне, транспартныя сродкі, лекі, тытунёвыя вырабы. Так, у 2002 г. з Германіі было імпартавана прадукцыі на 693,1 млн. дол. У тым ліку трактараў і сёдзельных цягачоў – на 52,7 млн. дол., машын і механізмаў для ўборкі і абмалоту сельскагаспадарчых культур – на 44,7 млн. дол., прычэпаў і паўпрычэпаў – на 36,5 млн. дол., лекавых сродкаў – на 18,4 млн. дол., тытунёвых вырабаў – на 4 млн. дол.

Удзельная вага ў імпарце Беларусі Украіны знізілася з 16% у 1992 г. да 3,2% ў 2002 г., альбо ў 5 разоў. Гэта было звязана як з паступовай пераарыентацыяй Украіны на рынкі па-за СНД, так і са скарачэннем рээкспарту праз тэрыторыю Беларусі ў Расію.

*Табліца 3*

| Краіны | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 | 2001 | 2002 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. Расія | 52,6 | 44,8 | 61,1 | 53,3 | 50,8 | 53,8 | 54,6 | 56,4 | 64,8 | 65,6 | 65,1 |
| 2. Германія | 3,1 | 15,4 | 11,4 | 7,6 | 8,7 | 8,0 | 8,9 | 10,4 | 6,8 | 7,3 | 7,6 |
| 3. Украіна | 16,0 | 6,4 | 4,9 | 10,2 | 12,8 | 11,1 | 8,7 | 6,2 | 3,9 | 3,4 | 3,2 |
| 4. Польшча | 2,7 | 3,9 | 4,3 | 3,5 | 2,8 | 2,9 | 3,3 | 3,2 | 2,6 | 2,4 | 2,4 |
| 5. Італія | 0,4 | 0,8 | 0,7 | 1,5 | 1,6 | 1,8 | 2,1 | 2,5 | 1,9 | 2,0 | 2,4 |
| 6. Літва | 1,5 | 0,9 | 0,5 | 2,1 | 2,2 | 2,2 | 2,4 | 1,5 | 0,8 | 1,3 | 1,2 |
| 7. Бразілія | 0 | 0,4 | 0 | 0,1 | 0,2 | 0,6 | 0,6 | 0,5 | 0,5 | 0,7 | 1,2 |
| 8. ЗША | 2,6 | 3,6 | 2,0 | 1,8 | 2,2 | 1,6 | 1,5 | 1,9 | 1,6 | 1,6 | 1,1 |

**Удзельная вага ў імпарце Беларусі краін – асноўных экспарцёраў прадукцыі ў Беларусь**

Імпарт з Польшчы з 1997 г. стабільна перавышаў 200 млн.дол. З Польшчы імпартуюцца харчовыя прадукты, машыны і абсталяванне, вырабы з драўніны. Толькі ў 2002 г. у Польшчы было куплена яблык, груш і айвы на 11,5 млн.дол., драўляна-стружкавых пліт – на 22,1 млн. дол., лямпаў і трубак электронных – на 16,9 млн. дол.

Да ліку экспарцёраў у нашу краіну, аб'ём імпарту з якіх перавысіў у 2002 г. 100 млн. дол., адносяцца таксама Італія, Літва, Бразілія, ЗША. З Італіі імпартуюцца спажывецкія тавары, прамысловае абсталяванне, вінаград, віны. Да паловы імпарту з Літвы прыходзіцца на электраэнэргію (у 2002 г. з 109 млн. дол. імпарту на электраэнергію прыпадала 55,6 млн. дол.). Большасць імпарту з Бразіліі – гэта цукар ( у 2002 г. – на 89,0 млн. дол. з 104,4 млн. дол. імпарту). З ЗША імпартуюцца прыборы, машыны і механізмы, лекі і спажывецкія тавары.

У выніку трэба адзначыць, што да ліку асноўных знешнегандлёвых партнёраў Беларусі, якія вызначыліся за гады яе самастойнага існавання, можна аднесці Расію, Германію, Украіну, Польшчу, Літву, якія мелі ў знешнегандлёвым тавараабароце Беларусі больш за 2% ў сярэднім за год, а таксама Латвію, якая мела ў сярэднім 1,9%, але апошнія 3 гады яе доля перавысіла 3%. Расія ў гэтай групе дамінуе, мае больш за палову ў тавараабароце Беларусі (ў сярэднім за год 54%). У гандлі РБ з Расіяй і Германіяй пераважае імпарт, з Латвіяй і Літвой – экспарт.

Найбольш беларускага экспарту накіроўваецца ў Расію, Латвію, Вялікабрытанію, Германію, Нідэрланды, Польшчу, Украіну, Літву і Кітай. Па велічыні імпарту ў Беларусь лідзіруюць Расія, Германія, Украіна, Польшча, Літва, а таксама Італія, ЗША, з 2002 г. – і Бразілія. У беларускім экспарце пераважае прадукцыя нафтаперапрацоўкі, машынабудавання, хімічнай прамысловасці, у імпарце – мінеральная сыравіна і энэргарэсурсы, прадукцыя машынабудавання, сыравіна для хімічнай і металургічнай вытворчасці. Для паспяховага эканамічнага развіцця, максімальнай рэалізацыі магчымасцяў на знешнім рынку, Беларусі патрэбна перманентная мадэрнізацыя прамысловага комплексу, транспартных магістраляў, стварэнне сэрвіснай інфраструктуры для падтрымання канкурэнтаздольнасці экспартна-імпартнай дзейнасці.

## ПРОБЛЕМЫ ЗАЩИТЫ ВНУТРЕННЕГО РЫНКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ПРИ КООРДИНАЦИИ ВСТУПЛЕНИЯ ВО ВСЕМИРНУЮ ТОРГОВУЮ ОРГАНИЗАЦИЮ С РОССИЙСКОЙ ФЕДЕРАЦИЕЙ

*Василевская М.В.,* Белорусский государственный университет

ВТО как специализированный орган международного регулирования экономического обмена постепенно трансформируется во все более сложную систему, охватывающую не только вопросы торговли, но и инвестиций, политики конкуренции и глобального бизнеса.

При присоединении к ВТО страна-кандидат принимает на себя определенные обязательства. Можно выделить два главных направления этих обязательств: это обязательства, связанные с необходимостью приведения национального законодательства и практики его применения в соответствие с нормами и правилами ВТО, а также согласование в ходе переговоров индивидуальных обязательств - условий доступа на рынок товаров и услуг. Именно с этими направлениями принятия обязательств могут быть связаны и основные экономические последствия присоединения страны к ВТО. Последствия принятия обязательств в рамках процесса присоединения могут носить как качественный ха-